ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 31 (480) | Субота, 31 кастрычніка 1981 года | Газета заснавана ў верасн. 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## VI АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

28-га кастрычніка адбылася VI агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Са справаздачным дакладам мясцкома выступіў яго старшыня **М. У. Акуліч.**

Затым быў заслухан справаздачны даклад старшыні рэвізійнай камісіі **І. К. Кекіша.**

У абмеркаванні справаздачных дакладаў прынялі ўдзел старшыні прафсаюзных бюро: фізічнага факультэта — **І. І. Старун,** гісторыка-філалагічнага — **У. Д. Еўтухоў,** біялагічнага — **С. К. Лапіцкая,** матэматычнага — **У. Р. Ермакоў,** памочнік прарэктара па АГР **М. П. Шкарбун,** галоўны бухгалтар **І. А. Курава,** старшыня культурна-масавай камісіі мясцовага камітэта **І. В. Хадалевіч,** прарэктар універсітэта **А. І. Балтоўскі,** сакратар парткома **М. І. Старавойтаў.**

Канферэнцыя прыняла разгорнутую пастанову па далейшаму паляпшэнню работы прафсаюзнай арганізацыі, прызнаўшы яе здавальняючай за справаздачны перыяд.

Выбраны новы састаў мясцовага камітэта, рэвізійнай камісіі, дэлегаты на XVI абласную канферэнцыю прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў.

У рабоце VI агульнауніверсітэцкай справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў прыняла ўдзел сакратар галіновага абкома прафсаюза **Л. С. Пікас.**

У новы састаў мясцовага камітэта выбраны: **А. Ф. Акулвіч**—ад геафака, **Г. М. Гадлеўская**—ад фізічнага факультэта, **У. П. Бабына** — ад эканомфака, **У. А. Баркоў** — ад факультэта фізвыхавання, **М. В. Бібікава** — ад эканомфака, **Л. А. Дзяменцьева** — ад АГЧ і ўпраўлення, **Ю. А. Кашын** — ад матфака, **В. А. Каляда** — ад кафедры фізвыхавання, **С. К. Лапіцкая** — ад біяфака, **Н. М. Канашэвіч** — ад грамадскіх кафедр, **Н. А. Палякова** — ад завочнага факультэта, **М. Н. Мурашка** — ад кафедры гісторыі КПСС, **Л. К. Сальнікава** — ад бібліятэкі, **У. Д. Еўтухоў** — ад гістфіла, **В. І. Конухаў** — ад фізічнага факультэта.

У састаў рэвізійнай камісіі выбраны **А. А. Скорава** з кафедры АМАЭІ, **Ю. Д. Алейнік** з вучэбнага аддзела, **Т. А. Бондарава** — нам. галоўнага бухгалтара.

Дэлегатамі на абласную прафсаюзную канферэнцыю выбраны **М. І. Акуліч, М. Н. Мурашка, М. В. Бібікава, Н. А. Палякова.**

На арганізацыйных пасяджэннях старшынёй мясцкома выбрана **М. Н. Мурашка,** старшынёй рэвізійнай камісіі — **А. А. Скорава,** утвораны пастаянна дзейнічаючыя камісіі мясцовага камітэта.

## ВЫБАРЫ НАРОДНАГА СУДДЗІ

У мінулую нядзелю праводзіліся выбары народнага суддзі Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Кандыдатам у народныя суддзі быў вылучаны **Аляксандр Адамавіч Федарцоў** 23-га кастрычніка ў нашым універсітэце адбылася сустрэча з ім.

З уступным словам выступіў сакратар парткома ГДУ М. І. Старавойтаў.

Пра жыццёвы шлях А. А. Федарцова расказала даверaная асоба старшыня цэхкома фабрыкі «8 Сакавіка» Р. В. Рыбакова.

А. А. Федарцоў нарадзіўся ў 1955 годзе ў в. Валькі Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Беларус, закончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, з кастрычніка 1976 года член КПСС. Аляксандр Адамавіч з 1980 года праходзіў стажыроўку народнага суддзі народнага суда Савецкага раёна г. Гомеля. Р. В. Рыбакова характарызавала яго як дастойнага кандыдата ў народныя суддзі Цэнтральнага раёна. Яе падтрымалі выступіўшыя на сустрэчы ад нашага універсітэта В. С. Каржоў і А. М. Твардоўская.

25-га кастрычніка на выбарчых участках № 5 і № 9, якія размяшчаліся ў вучэбных карпусах № 1 і № 2, ва ўрачыстай абстаноўцы праходзілі выбары народнага суддзі народнага суда Цэнтральнага раёна. Усе выбаршчыкі аднадушна аддалі свае галасы за Аляксандра Адамавіча Федарцова.

**(Наш кар.).**

## ЦЯПЛО БРАТЭРСКІХ СУСТРЭЧ

На гэтым тыдні на Гомельшчыне прайшло рэспубліканскае свята кнігі «Широка страна моя родная», якое прысвячалася 60-годдзю ўтварэння СССР. На сапраўднае свята дружбы, што праходзіла пад дэвізам «Дружба народаў — дружба літаратур» сабраліся вядомыя пісьменнікі і паэты, актывісты таварыства аматараў кнігі не толькі з нашай рэспублікі, але і пасланцы братніх абласцей — Бранскай і Чарнігаўскай.

Шырокай і змястоўнай была праграма свята кнігі. Гэта і знаёмства са шматлікімі тэматычнымі выстаўкамі літаратуры з твораў беларускіх аўтараў, што апублікаваны на многіх мовах народаў СССР, і сустрэчы пісьменнікаў і паэтаў з чытачамі і г. д.

Асноўнай падзеяй свята стаў урачысты вечар у Гомельскім Палацы культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна. Тут на сустрэчу з вядомымі майстрамі слова сабраліся іх чытачы. Адкрыла гэты своеасаблівы сход сакратар Гомельскага гаркома КПБ Н. Ф. Іванова. Ва ўступным слове старшыня праўлення абласнога аддзялення таварыства аматараў кнігі, прарэктар па вучэбнай рабоце нашага універсітэта Л. А. Шамяткоў адзначыў, што ў вобласці існуюць цесныя ўзаемасувязі з літаратарамі многіх рэспублік нашай краіны. Традыцыйнымі сталі і сустрэчы чытачоў з імі.

Затым пад гарачыя апладысменты ўсіх прысутных слова было прадастаўлена ганароваму госцю свята, народнаму пісьменніку рэспублікі, Герою Сацыялістычнай Працы І. П. Шамякіну.

Іван Пятровіч гаварыў аб праблемах, якімі жыве зараз наша літаратура, падзяліўся асабістымі творчым планамі на будучае, адказаў на шматлікія пытанні.

Затым выступіла беларуская паэтэса Раіса Баравікова, якая прачытала свае вершы.

Братняй дружбе народаў нашай краіны ў цяжкія і гераічныя гады Вялікай Айчыннай вайны прысвяціў сваё выступленне госць з Бранска, паэт, заслужаны работнік культуры РСФСР Валянцін Дзінабургскі. Мужнасць савецкіх людзей, іх патрыятызм — такая асноўная тэма прачытаных ім вершаў.

На сустрэчы выступілі таксама вядомыя беларускія аўтары Леанід Дайнека, Мікола Чарняўскі, Анатоль Грачанікаў, Уладзімір Верамейчык, Віктар Ярац.

Свята кнігі, якое прайшло на Гомельшчыне, стала значным укладам у праграму прапаганды літаратуры, прысвечанай 60-годдзю ўтварэння СССР і распрацоўваемай таварыствам аматараў кнігі рэспублікі.



**Фізіка — навука складаная і дакладная. Ад таго, хто вырашыў звязаць з ёй свой лёс, яна патрабуе сканцэнтраванасці і настойлівасці. Праз некаторы час стануць фізікамі і студэнты групы Ф-35 фізфака Алег Юркоў і Сяргей Бычкоў. А пакуль што яны набываюць веды на лекцыях, у вучэбных лабараторыях.**

Фота **У. Чысціка.**

## ЮБІЛЕЙНАЯ АЛЕЯ

У мінулую суботу выкладчыкі і супрацоўнікі біялагічнага факультэта заклалі юбілейную алею ў гонар 20-годдзя аграбіялагічнай станцыі «Старыя Чонкі». Гэтым пакладзены пачатак вялікай рабоце па ажыццяўленню генеральнага плана работ па азеляненню на прадстаячае дзесяцігоддзе.

Да 1985 года плануецца закласці дэндрапарк, дзе будуць расці каля 2000 дрэў і кустоў прыкладна 10 відаў. Тут мяркуецца пасадзіць шэраг алей і стварыць паляну дружбы. Асноўныя работы ў дэндрапарку будуць праведзены ў наступным годзе, а папаўненне яго іншымі пародамі дрэў і кустоў розных відаў будзе працягвацца да 1990 года.

На другім этапе работ па азеляненню будзе праводзіцца абсадка жылой зоны дрэвамі, значна пашырыцца плошча пад кветнікі і клумбы. Больш будзе высаджана пладовых дрэў. Адным словам, да 1990 года біялагічная станцыя будзе ўяўляць сабой батанічны сад у мініяцюры з самымі разнастайнымі відамі дрэвавых і хмызняковых парод, а таксама травяных раслін.

У час суботніка, акрамя закладзенай юбілейнай алеі, выкананы вялікі аб'ём іншых работ па добраўпарадкаванню тэрыторыі аграбіястанцыі. Каля новых фінскіх домікаў высаджана 100 карэнішчаў, на метадычным участку абкапаны кусты парэчак, іншыя дрэвы, пашырана кветкавая клумба.

Добра папрацавалі на суботніку ўсе выкладчыкі і супрацоўнікі. Прыклад у працы паказалі Л. М. Сапегін, Л. Н. Алімава, С. Ф. Алешка, Р. І. Маркелава, Л. П. Моладава і інш.

**М. БАЙДА,**
**дырэктар біястанцыі.**



НА ЗДЫМКУ: у студэнтаў групы 0-42 ідуць практычныя заняткі па навуковай арганізацыі кіравання вытворчасцю, якія вядзе дацэнт Я. Я. Вяршыгара.

Фота **У. Чысціка.**

СТУДЭНЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ

## ПРАДЭМАНСТРАВАЛІ ЗДОЛЬНАСЦІ

У студэнтаў ёсць свае няпісаныя законы. Адзін з іх сцвярджае: «Першакурснік, які не здаў першую сесію, яшчэ не студэнт». Але паспяхова вытрымаць гэта выпрабаванне можа толькі дружны, моцны калектыў.

Конкурс «Ану, першакурснікі!» з'явіўся першай сур'ёзнай праверкай згуртаванасці, арганізаванасці ўчарашніх абітурыентаў. Ён дапамагае раскрыць здольнасці студэнтаў, прыцягвае першакурснікаў да грамадскага і культурнага жыцця факультэта.

Як жа падрыхтаваліся да першага выпрабавання сёлетнія першакурснікі эканамічнага факультэта? Увесь вечар гучалі ў актавай зале музыка, песні, вясёлы студэнцкі гумар. Адбылося шмат прэм'ер: была выканана песня, спецыяльна напісаная да гэтага дня студэнтамі групы 0-13. Свае вершы, прысвечаныя памяці дзекабрыстаў, прачытаў на конкурсе студэнт групы Т-11 С. Цітоў.

Спецыяльнымі прызамі журы адзначыла выступленне студэнткі групы Т-12 Т. Дудзінай, якая выканала цыганскі танец, і А. Баранавай з групы 0-11 за танец у сучасных рытмах.

Своеасаблівую і арыгінальную праграму прадставілі на конкурс першакурснікі групы 0-11.

Без пачуцця гумару няма сапраўднага студэнта. Гэта даказалі першакурснікі групы Т-14. За арыгінальнасць і высокае майстэрства выканання рок-групе «Пиджаки» журы прысудзіла спецыяльны прыз.

Пераможцамі конкурсу «Ану, першакурснікі!» сталі студэнты групы 0-13, на другім і трэцім месцах— групы 0-11 і Т-14. Спецыяльнага прыза ўдастоена эмблема і насценная газета групы Т-13.

Былі ў конкурсе і сур'ёзныя недапрацоўкі. Некаторыя праграмы рыхтаваліся не па тэме, не была вытрымана паслядоўнасць у выкананні нумароў.

Пажадаем нашым першакурснікам паспяхова выступіць на агульнауніверсітэцкім конкурсе «Ану, першакурснікі!»

**В. ГРОМАВА,**
**студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта.**

# ПРЫРОДА І ТЫ

*Выпуск № 18*



## СВЕТ НЯБАЧНЫХ ІСТОТ

Водныя арганізмы бываюць розных памераў. Сярод іх ёсць жывёлы, якія няўзброеным вокам не бачны. Такія і калаўроткі, размеры цела якіх не перавышаюць 1—2 мм. У асноўнай сваёй масе — гэта свабоднажывучыя віды і толькі нямногія з іх вядуць прымацаваны спосаб жыцця. У састаў гэтага класа ўваходзіць звыш 1500 відаў жывёл.

Сваю назву калаўроткі атрымалі дзякуючы наяўнасці на галаве спецыфічнага органа — колаваротнага апарата. Ён мае выгляд дыска, усаджанага на краю венчыкам буйных раснічак. Калаўротны апарат у аднолькавай ступені служыць як для перамяшчэння, так і для харчавання калаўротак.

Хаця калаўроткі з'яўляюцца дробнымі арганізмамі, іх роля ў прыродных экасістэмах вялікая. Важнае значэнне яны маюць у харчаванні рыб: карпавых, селядцовых, асётравых, сігавых. Несумненна тое, што калаўроткі адыгрываюць вялікую ролю ў самаачышчэнні вадаёмаў. Разам з водарасцямі і бактэрыямі калаўроткі могуць паглынаць радыёактыўныя элементы, выдаляючы іх з вады. Некаторыя віды служаць індыкатарамі кіслотнасці вадаёмаў.

**А. ЯКІМОВІЧ,**
**студэнтка біяфака.**

## ВЯЛІКАЯ КАРЫСЦЬ МАЛЕНЬКІХ ЖЫХАРОЎ

Сярод вялізнай арміі насякомых, шасціногіх апыляльнікаў, першае месца, бясспрэчна, належыць пчолам і чмялям. З таго часу, як адкрылі, што пчолы апыляюць расліны, людзі не раз пераконваліся, што без насякомых многія сельскагаспадарчыя культуры застаюцца бясплоднымі. Так, еўрапейскія каланізатары Аўстраліі доўгі час не маглі зразумець, чаму яблыня і канюшына, завезеныя на гэты кантынент, не давалі пладоў і насення, хаця і добра цвілі. Калі, нарэшце, прычына была ўстаноўлена і ў Аўстралію завезлі чмялёў і пчол, у садах сталі налівацца сакавітыя плады, а канюшынныя лугі — даваць шмат насення.

Пчолы і чмялі апыляюць многія расліны. Дзякуючы іх тытанічнай працы пладаносяць сады і ягаднікі, бахчавыя і тэхнічныя культуры, кармавыя травы, многія дрэвы, лясныя і палявыя кветкі. У нашай краіне звыш сотні сельскагаспадарчых культур не здольны даваць плады без апылення пчоламі. Апыляючы кветкі, пчолы збіраюць нектар і выпрацоўваюць каштоўны прадукт — мёд. Каб сабраць адзін яго кілаграм, трэба ўзяць нектар прыкладна з 19 мільёнаў кветак і налятаць пры гэтым 300 тыс. км, гэта значыць тры чвэрці адлегласці ад Зямлі да Месяца. Адна пчала за жыццё наведвае 150—200 тыс. кветак. Значыць, адзін кілаграм мёду могуць сабраць 115—125 пчол на працягу свайго жыцця.

За адзін сезон з апыленых адной пчалой яблынь можа сфарміравацца 2843000 яблык!

Акрамя дамашняй пчалы ў прыродзе існуе 30 тыс. відаў дзікіх пчол. Яны як апыляльнікі прыносяць не меншую карысць, чым дамашнія, але іх жыццё яшчэ мала вывучана.

Сабраты пчол — чмялі яшчэ больш працалюбівыя. Іх рабочы дзень больш працяглы. Яны распаўсюджаны далёка на поўнач і добра пераносяць халодны суровы клімат і непагадзь. Пры невялікім дажджы і ветры, калі ўсе пчолы сядзяць па дамах, чмялі працягваюць працаваць.

Апыляльнікамі кветак з'яўляюцца осы, многія дзённыя і начныя матылькі, жукі, кветкавыя і некаторыя іншыя мухі.

Сярод жукоў рэкардсменамі можна лічыць кветкавых вусачоў, якія харчуюцца пылком грэчкі. У бязветранае надвор'е яны наведваюць 10—12 кветак у мінуту. На тых палях, дзе іх многа, яны апыляюць раслін больш, чым пчолы.

Сярод мух і камароў таксама многа актыўных апыляльнікаў. Гэта таўкунчыкі, жужалі, мошкі, сапраўдныя мухі, даўганожкі і інш. Як гэта ні парадаксальна, але, чым больш нясцерпнымі і густымі становяцца хмары гнюсу, тым больш узрастае яго карысная роля для раслін, асабліва ў тундры. Гэты факт сведчыць аб тым, што і ў шкодных насякомых, такіх як крывасосныя мухі і камары, могуць быць некаторыя асновы для «рэабілітацыі». Гэта не азначае, канешне, што супраць іх трэба спыніць барацьбу, але і ўказвае на тое, што нельга не ўлічваць іх карысную ролю ў падтрыманні прыроднай раўнавагі.

**Л. МОЛАДАВА,**
**дацэнт кафедры заалогіі і дарвінізму.**

## НОВЫ ЭКСПАНАТ МУЗЕЯ

Экспазіцыя музея кафедры заалогіі і дарвінізму папоўнілася новым экспанатам. Гэта чучала вушастага вожыка, якога прывезлі студэнты чацвёртага курса біялагічнага факультэта з летняй навукова-вытворчай практыкі. Праходзіла практыка ў раёне Чаграйскага водасховішча Калмыцкай АССР. Кіраўнікамі былі В. А. Гараеў і Д. А. Басава.

Вушасты вожык несумненна падобны на нашага звычайнага, але выдатнай яго асаблівасцю з'яўляюцца вушы. Яны выразна выдзяляюцца на галаве. Вялікія па размерах, калі іх адагнуць уперад, вушы закрываюць вочы. Вушасты вожык больш зграбны за звычайнага, калючы покрыў у яго больш мяккі. Важыць ён амаль у два разы менш звычайнага.

Навукы вушасты вожык стаў вядомы з 1770 года. У нас у краіне ён сустракаецца ад Растоўскай вобласці да Алтая, уключаючы абжытыя ім раёны раўнін і перадгор'яў Казахстана, Сярэдняй Азіі.

Вушасты вожык харчуецца насякомымі, акрамя іх, яго здабычай становяцца яйкі птушак, якія гняздуюцца на зямлі, птушаняты, яшчаркі, жабы. Сустракаюцца ў яго рацыёне парасткі і насенне злакаў. А вось змей вушасты вожык пазбягае. Жыхарка паўпустынь гюрза сама не супраць паласавацца вожыкам. Пры гэтым іголкі не з'яўляюцца перашкодай. Наогул, ворагаў у вожыка хапае: начныя драпежнікі, лісіцы, шакалы, ваўкі, дзікія каты.

Узімку вожык упадае ў спячку, затое ўвесь астатні час гэта карысная жывёла знішчае масу разнастайных насякомых-шкоднікаў.

**А. ЕМЯЛЬЯНАВА,**
**стажор-выкладчык кафедры заалогіі і дарвінізму.**



Работа выканана Т. Бандарэнка.
Фота Л. Залескай.

*Пошукі і адкрыцці*

## ЦІ ІСНУЕ РЭЧЫВА ПАМЯЦІ?

**Савецкія вучоныя атрымалі новае пацвярджэнне гіпотэзы аб хімічнай прыродзе даўгачаснай памяці.**

Чаму мы памятаем тое, што адбывалася з намі раней? Які механізм запамінання слоў і гукаў, пахаў і зрокавых вобразаў?

...Калі былі створаны першыя электронна-вылічальныя машыны, нарадзілася гіпотэза, згодна з якой чалавечы мозг працуе ў прынцыпе гэтак жа, як мозг ЭВМ, што аперыруе толькі лаканічнымі электрычнымі сігналамі «так» і «не». Здавалася, што дастаткова стварыць вельмі вялікую ЭВМ— і праблема штучнага інтэлекту будзе вырашана. Такой жа яснай уяўлялася і прырода чалавечай памяці: лагічна было меркаваць, што працэс запамінання заключаецца ў фарміраванні ланцугоў клетак-нейтронаў, па якіх могуць бесперашкодна праходзіць нервовыя імпульсы.

Аднак па меры накаплення эксперыментальных фактаў станавілася ясным, што паміж ЭВМ і жывым мозгам значна больш адрозненняў, чым падабенства. Самы просты прыклад: сабака імгненна адрознівае кошку ад сабакі, але ніводная нават самая хуткадзеючая ЭВМ не здольна адразу і беспамылкова рашыць гэту задачу. Беспадстаўнай аказалася і электрычная гіпотэза даўгачаснай памяці: ні глыбокае ахаладжэнне арганізма, у выніку якога электрычная актыўнасць мозга поўнасцю спынялася, ні электрашок, пад дзеяннем якога рэзка парушалася нармальная работа мозгу, не аказвалі ніякага ўплыву на інфармацыю, занесеную на працяглае захоўванне.

Акадэмік Юрый Анатольевіч Аўчыннікаў яшчэ ў 1965 годзе выказаў меркаванне, што матэрыяльнай асновай памяці могуць служыць пептыды — рэчывы, малекулы якіх, як і малекулы бялкоў, пабудаваны з амінакіслот, але толькі маюць меншыя размеры. Яны ўтрымліваюць 10—20 амінакіслотных рэшткаў. Разлікі паказвалі, што інфармацыйныя магчымасці пептыдаў надзвычай вялікія: усяго з 15 амінакіслотных рэшткаў можна пабудаваць столькі розных пептыдных малекул, што з іх дапамогай удасца запісаць змест памяці 10.000 дарослых людзей!

І сапраўды, цяпер нямала фактаў, што сведчаць на карысць гіпотэзы акадэміка Аўчыннікава. Ужо атрыманы і даследаваны пептыды, якія валодаюць здольнасцю аказваць моцнае, але надзвычай тонкае дзеянне на цэнтральную нервовую сістэму.

Нядаўна доктар медыцынскіх навук Генрык Вартанян (Інстытут эксперыментальнай медыцыны АМН СССР) паведаміў аб здзіўляючых доследах, якія абяцаюць у перспектыве магчымасць лячэння некаторых цяжкіх выпадкаў захворванняў цэнтральнай нервовай сістэмы.

У пазваночных каардынацыя рухаў кантралюецца галоўным чынам мазжачком. Калі ў жывёліны пашкоджана якая-небудзь частка мазжачка, то надыходзіць парушэнне ўзгодненай работы той ці іншай групы мышцаў. Але калі поўнасцю разарваць сувязь паміж галаўным мозгам, які ажыццяўляе вярхоўны кантроль, і спінным мозгам, які кіруе безумоўнымі рэфлексамі, то нармальная рухомасць мышцаў аднаўляецца. Але аднаўляецца яна толькі ў тым выпадку, калі паміж аперацыяй на мазжачку і разрывам сувязі паміж галаўным мозгам і спінным прайшло не больш чым 45 мінут; у іншым выпадку парушэнне каардынацыі захоўваецца.

Гэты факт можна растлумачыць так: за 45 мінут інфармацыя аб паражэнні мазжачка нейкім чынам перадаецца ў спінны мозг і там замацоўваецца.

А што калі гэта інфармацыя перадаецца пры дапамозе хімічных рэчываў, што знаходзяцца ў спіннамазгавой вадкасці?

Быў зроблены такідослед: з мозга жывёліны з пашкоджаным мазжачком быў прыгатаваны экстракт, уведзены затым у мозг здаровай жывёліны. І што ж? У яе ўзнікла такое ж парушэнне каардынацыі, што і ў жывёліны, у якой была зроблена аперацыя на мазжачку. Пры гэтым уражваюць дзве асаблівасці назіраемай з'явы. Па-першае, экстракт мозгу захоўвае інфармацыю аб тым, якая іменна — левая ці правая — лапа павінна перастаць нармальна працаваць. Па-другое, хімічны агент, што нясе гэту інфармацыю, аказаўся пазбаўленым відавой спецыфічнасці.

Такім чынам, відавочна, што пры паражэнні галаўнога мозга ў ім выпрацоўваюцца універсальныя рэчывы, што нясуць інфармацыю аб характары паражэння, і гэта інфармацыя замацоўваецца ў даўгачаснай памяці мозга.

Але навошта ўсё гэта патрэбна? Навошта мозгу запамінаць аб катастрофе, у той час як больш лагічна і мэтазгодна было б як мага хутчэй забыць пра гэта няшчасце?

У адрозненне ад любой, нават самай дасканалай машыны, створанай чалавекам, жывы арганізм валодае здзіўляючай здольнасцю да самарамонту, самалячэння або, прынамсі, да кампенсацыі страчаных функцый.

Так і пры паражэнні часткі мазжачка ў жывёліны пачынаюцца нябачныя рамонтныя работы, у выніку якіх прыкладна праз тры тыдні рухальная актыўнасць канечнасці аднаўляецца.

Пакуль яшчэ цяжка меркаваць аб магчымых практычных выніках вывучэння рэчываў памяці. Перш чым гэтыя рэчывы будуць узяты на ўзбраенне медыцынай, вучоным прыйдзецца адказаць на мноства пытанняў прынцыповага характару.

**В. ХРАМАЎ.**
**(АДН).**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Дэканат эканамічнага факультэта, калектыў кафедры ўліку і статыстыкі выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыцы гэтай кафедры ЛЯЧЫК Ірыне Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.
Заказ 5879
АЗ 50692